УДК 940. 3/. 4 + 325. 8 (476)

**Аб некаторых аспектах вывучэння беларускай культуры ў гады Першай сусветнай вайны (1914-1918 гг.) у курсе «Гісторыя Беларусі»**

Шчаўлінскі М.Б.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Першая сусветная вайна стварыла цяжкія ўмовы для развіцця беларускай нацыянальнай культуры. Увядзенне 18 ліпеня 1914г. у беларускіх губернях ваеннага становішча, набліжэнне да тэрыторыі Беларусі расійска-германскага фронту паралізавала дзейнасць такіх беларускіх газет і часопісаў, як «Лучынка», «Беларус», «Саха», «Наша ніва». Але, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, – увядзенне ваенага становішча, фізічныя і матэрыяльныя страты – беларуская справа не памерла.

На акупіраванай восенню 1915г. нямецкімі войскамі заходняй часткі Беларусі, нацыянальную працу працягвала невялікая група беларускіх дзеячаў, сярод якіх былі В.Ластоўскі, А.Пашкевіч (Цётка), браты Іван і Антон Луцкевічы, У.Святаполк-Мірскі, Талочка і інш. Іх намаганнямі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1915 – 1917 гг. былі адчынены 89 беларускіх школ, настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы і настаўніцкія курсы ў Вільні. Выходзіла газета «Гоман», дзейнічалі Беларускі клуб з тэатрам Ф.Аляхновіча, беларуская бібліятэка і кнігарня.

Значных поспехаў развіццё беларускай культуры дасягнула пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917г. на вольнай ад германскай акупацыі тэрыторыі Беларусі. У сакавіку 1917г. у Мінску быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), а пад яго эгідай заснавана Таварыства беларускай культуры. 28 мая 1917г. пад рэдакцыяй Я.Лёсіка пачала выдавацца газета «Вольная Беларусь». Акрамя «Вольнай Беларусі» ў Мінску ў 1917г. выходзіла газета «Беларуская рада», а ў Віцебску выдаваўся часопіс «Витебский край», дзейнічаў беларускі тэатр.

Не менш поспяхова беларуская культура развівалася ў межах абвешчанай у сакавіку 1918г. БНР. Паводле розных падлікаў, у зоне нямецкай акупацыі ў 1918г. дзейнічалі каля 350 школ. У мястэчку Свіслач працавала настаўніцкая семінарыя, у Слуцку, Будславе, Мінску, Навагрудку, Гародні дзейнічалі беларускія гімназіі. Пад кантролем Народнага сакратарыята выходзіла ў той час 14 газет і часопісаў на беларускай мове, сярод якіх «Гоман», «Вольная Беларусь», «Крыніца», «Беларускі шлях», «Варта», «Родны край».

Такім чынам, нягледзячы на цяжкасці, створаныя Першай сусветнай вайной, развіццё беларускай культуры дасягнула значных поспехаў.